# Кароткі слоўнік тэрмінаў у сферы роўнасці і недыскрымінацыі на беларускай мове

# Glossary of Key Terms on Equality and Non-discrimination in Belarusian



COUNCIL OF EUROPE

CONSEIL DE L'EUROPE

# Кароткі слоўнік тэрмінаў ў сферы роўнасці і недыскрымінацыі на беларускай мове

# Glossary of Key Terms on Equality and Non-discrimination in Belarusian

**Аўтаркі-складальніцы:**
Кацярына Дзяйкала і Кацярына Кузняцова
**Перакладчык:**
Алесь Лагвінец

**Authors and Compilers:**
Ekaterina Deikalo and Ekaterina Kouznetsova
**Translator:**
Aleś Łahviniec

Рады Еўропы / Council of Europe

*The opinions expressed in this work are the responsibility of the authors and do not necessarily reflect the official policy of the Council of Europe.*

The reproduction of extracts (up to 500 words) is authorised, except for commercial purposes, as long as the integrity of the text is preserved, the excerpt is not used out of context, does not provide incomplete information or does not otherwise mislead the reader as to the nature, scope or content of the text. The source text must always be acknowledged as follows: "© Council of Europe, year of the publication".

All other requests concerning the reproduction/translation of all or part of the document should be addressed to the Publications and Visual Identity Division, Council of Europe (F-67075 Strasbourg Cedex or publishing@coe.int).

All other correspondence concerning this document should be addressed to the Directorate General of Democracy and Human Dignity – Anti-discrimination Co-operation Unit, F-67075 Strasbourg Cedex, France
E-mail: anti-discrimination@coe.int

Cover design and layout: Publications and Visual Identity Division, Council of Europe

Photo: Shutterstock

This publication has not been copy-edited by the SPDP Editorial Unit to correct typographical and grammatical errors.

© Council of Europe, September 2025.
Printed at the Council of Europe

# ЗМЕСТ / TABLE OF CONTENTS


| | |
|---|---|
| УВОДЗІНЫ | 5 |
| INTRODUCTION | 5 |
| ПРАДМОВА АД РАДЫ ЕЎРОПЫ | 6 |
| FOREWORD FROM THE COUNCIL OF EUROPE | 7 |
| ПРАДМОВА АД ОФІСУ СВЯТЛАНЫ ЦІХАНОЎСКАЙ | 8 |
| FOREWORD FROM THE SVIATLANA TSIKHANOUSKAYA'S OFFICE | 9 |
| ПРАДМОВА АД БЕЛАРУСКАГА ХЕЛЬСІНКСКАГА КАМІТЭТА | 10 |
| FOREWORD FROM THE BELARUSIAN HELSINKI COMMITTEE | 11 |
| ЧАСТКА 1.<br>БЕЛАРУСКА-АНГЛІЙСКІ СЛОЎНІК З ТЛУМАЧЭННЕМ АСНОЎНЫХ ТЭРМІНАЎ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ<br>SECTION 1.<br>BELARUSIAN-ENGLISH GLOSSARY WITH EXPLANATIONS OF KEY TERMS IN BELARUSIAN | 13 |
| ЧАСТКА 2.<br>АНГЛІЙСКА-БЕЛАРУСКАЯ ТАБЛІЦА АДПАВЕДНАСЦІ АСНОЎНЫХ ТЭРМІНАЎ<br>SECTION 2.<br>ENGLISH-BELARUSIAN CORRESPONDENCE TABLE OF KEY TERMS | 27 |

# Уводзіны

Гэты слоўнік зроблены ў рамках працы Кантактнай групы Рады Еўропы па супрацоўніцтве з беларускімі дэмакратычнымі сіламі і грамадзянскай супольнасцю.

Слоўнік з'явіўся як адзін з вынікаў серыі трэнінгаў "Еўрапейскія стандарты ў сферы роўнасці і антыдыскрымінацыі для беларускай грамадзянскай супольнасці і дэмакратычных сілаў" (снежань 2024 – верасень 2025). Таксама пры яго складанні ўлічвалася тэрміналогія Канцэпцыі сістэмы захадаў па барацьбе з дыскрымінацыяй і забеспячэнні роўнасці ў Беларусі, у тым ліку канцэпцыі Закона "Аб роўнасці і недыскрымінацыі" для дэмакратычнай Беларусі (распрацаваныя ў 2023 годзе).

Слоўнік не з'яўляецца вычарпальным і змяшчае асноўную тэрміналогію ў сферы роўнасці і недыскрымінацыі. Як тэрміны, так і іх тлумачэнні базуюцца на міжнародных і еўрапейскіх стандартах у гэтай галіне, ахопліваючы ў тым ліку антыдыскрымінацыйныя прававыя нормы Еўрапейскага Саюзу (acquis), Агульныя палітычныя рэкамендацыі Еўрапейскай камісіі супраць расізму і нецярпімасці (ECRI), а таксама практыку Еўрапейскага суда па правах чалавека[1].

Слоўнік складаецца з дзвюх частак: беларуска-англійскі слоўнік з тлумачэннямі тэрмінаў на беларускай мове, і англійска-беларускі слоўнік тых жа тэрмінаў без тлумачэння.

# Introduction

This glossary was developed within the framework of the Council of Europe Contact Group on Cooperation with Belarusian Democratic Forces and Civil Society.

The glossary serves as one of the outcomes of a Training Series on European Standards on Equality and Non-discrimination for Belarusian civil society and democratic forces (December 2024 – September 2025). This glossary also draws on terminology from the Concept for a System of Measures to Combat Discrimination and Ensure Equality in Belarus, including the concept of the Law "On Equality and Non-discrimination" for a democratic Belarus (developed in 2023).

The glossary contains basic terminology in the field of equality and non-discrimination and is not intended to cover all relevant terms. Both the terms and their explanations are based on international and European standards in this domain, including the European Union anti-discrimination acquis, the General Policy Recommendations of the European Commission against Racism and Intolerance (ECRI), and the case law of the European Court of Human Rights.[1]

The glossary consists of two parts: a Belarusian-English section with explanations of the terms in Belarusian, and an English-Belarusian section with the same terms but without explanations.

1 Гл. у тым ліку / See also: Protecting Minority Rights – A Practical Guide to Developing Comprehensive Anti-Discrimination Legislation, 2022; Handbook on European non-discrimination law – 2018 edition; ECRI Glossary; PACE Resolution 2191 "Promoting the human rights of and eliminating discrimination against intersex people", 2017; Human rights and intersex people. Issue Paper, 2015.

# Прадмова ад Рады Еўропы

З вялікім задавальненнем прадстаўляю гэты Кароткі слоўнік тэрмінаў Рады Еўропы ў сферы роўнасці і антыдыскрымінацыі на беларускай мове – унікальнае дасягненне, якое адлюстроўвае як інавацыі, так і рашучасць у нашым супрацоўніцтве з дэмакратычнымі сіламі і грамадзянскай супольнасцю Беларусі. Гэта супрацоўніцтва, якое ажыццяўляецца праз новыя і крэатыўныя формы ўзаемадзеяння ў сучасным міжнародным кантэксце, увасобленыя ў Кантактнай групе Рады Еўропы па Беларусі, пацвярджае імкненне Рады Еўропы стаяць побач з тымі, хто нястомна абараняе дэмакратыю, правы чалавека і годнасць.

Я хачу падзякаваць прадстаўнікам беларускіх дэмакратычных сіл і грамадзянскай супольнасці, у тым ліку Беларускаму Хельсінкскаму Камітэту, за іх неацэнную падтрымку і нязменную адданасць. Іх партнёрства неабходнае дляператварэння прынцыпаў у практычныя інструменты, якія ўмацуюць патэнцыял дэмакратычнага беларускага грамадства. Я таксама шчыра дзякую Еўрапейскаму Саюзу за яго фінансавую падтрымку праз нашу флагманскую сумесную праграму «Партнёрства дзеля належнага кіравання (PGG)», без якой гэтая ініцыятыва была б немагчымай.

Кароткі слоўнік тэрмінаў з’явіўся ў выніку адаптацыі на беларускую мову нашай серыі навучальных курсаў па барацьбе з дыскрымінацыяй.

Пераклад і адаптацыя трох анлайн-курсаў выявілі неабходнасць надзейнай даведкавай крыніцы, якая б забяспечвала ўзгодненасць, адказнасць і доўгатэрміновую ўстойлівасць. Гэты слоўнік задавальняе гэтую патрэбу. Ён ахоплівае ключавую тэрміналогію ў галіне роўнасці і недыскрымінацыі, у тым ліку формы дыскрымінацыі, абароненыя падставы, мову нянавісці і ксенафобію, і дае азначэнні на беларускай мове. Англа-беларускі раздзел дапаўняе працу, пералічваючы тыя ж тэрміны без тлумачэнняў. Беларускі Хельсінкскі Камітэт ужо заявіў аб намеры і неабходнасці ўзгадніць беларускую версію праекта Канцэпцыі закона аб барацьбе з дыскрымінацыяй з тэрміналогіяй гэтага слоўніка, у той жа час ад Дэмакратычных сілаў таксама чакаецца, што яны будуць выкарыстоўваць яго ў сваёй будучай адвакацыйнай і палітычнай працы.

Гэтая ініцыятыва цесна перагукаецца з мандатам Дырэкцыі па роўных правах і годнасці, які працуе над падтрыманнем роўнасці, барацьбой з дыскрымінацыяй, мовай нянавісці і злачынствамі на глебе нянавісці, а таксама над прасоўваннем правоў тых, хто найбольш уразлівы да выключэння. Дырэкцыя кіруе міжурадавай працай Рады Еўропы праз такія органы, як Кіраўнічы камітэт па пытаннях антыдыскрымінацыі, разнастайнасці і інклюзіўнасці (CDADI), Еўрапейская камісія па барацьбе з расізмам і нецярпімасцю (ECRI), а таксама механізмы маніторынгу Рамачнай канвенцыі аб абароне нацыянальных меншасцяў і Еўрапейскай хартыі рэгіянальных моваў або моваў меншасцяў. Акрамя таго, яна падтрымлівае дзяржавы-чальцы праз праграмы супрацоўніцтва, ініцыятывы па міжкультурнай інклюзіўнасці, інклюзія ромаў і вандроўных, стратэгіі гендарнай роўнасці і дзеянні супраць мовы нянавісці, злачынстваў на глебе нянавісці і гвалту ў адносінах да жанчын/хатняга гвалту, а таксама эксплуатацыі і гандлю людзьмі.

Такім чынам, дадзены слоўнік – гэта значна больш, чым проста лінгвістычны інструмент: гэта канкрэтны крок да Беларусі, дзе роўнасць і чалавечая годнасць будуць служыць асновай моцнай і трывалай дэмакратыі.

**Халвард Горсет**
Дырэктар па роўных правах і годнасці
Рада Еўропы

# Foreword from the Council of Europe

It is with great pleasure that I present this Council of Europe Anti-discrimination and Equality Glossary in the Belarusian language, a unique achievement that reflects both innovation and determination in our co-operation with the democratic forces and civil society of Belarus. These co-operation activities, carried out through new and creative forms of engagement in the current international context – embodied in the Council of Europe Contact Group on Belarus – affirm the Council of Europe's commitment to stand alongside those who tirelessly defend democracy, human rights and dignity.

I wish to commend the representatives of the Belarusian Democratic Forces and Civil Society, including the Belarusian Helsinki Committee, for their invaluable support and steadfast dedication. Their partnership has been essential in turning principles into practical tools that will strengthen the capacity of a democratic Belarusian society. I also warmly thank the European Union for its financial support through our flagship joint programme 'Partnership for Good Governance (PGG)', without which this initiative would not have been possible.

The Glossary emerged from the adaptation of our anti-discrimination training series into Belarusian. The translation and adaptation of three online courses revealed the need for a reliable reference tool that would ensure coherence, ownership and long-term sustainability. This Glossary meets that need. It brings together key terminology in the fields of equality and non-discrimination – including forms of discrimination, protected grounds, hate speech and xenophobia – and provides definitions in Belarusian. An English-Belarusian section complements the work by listing the same terms without explanations. The Belarusian Helsinki Committee has already committed to aligning the Belarusian version of the draft Concept Law on Anti-discrimination with the terminology of this Glossary, while the Democratic Forces are likewise expected to draw on it in their future advocacy and policy work.

This initiative resonates closely with the mandate of the Directorate of Equal Rights and Dignity, which works to uphold equality, combat discrimination, hate speech and hate crime, and to promote the rights of those most exposed to exclusion. The Directorate steers the Council of Europe's intergovernmental work through bodies such as the Steering Committee on Anti-discrimination, Diversity and Inclusion (CDADI), the European Commission against Racism and Intolerance (ECRI), and the monitoring mechanisms of the Framework Convention for the Protection of National Minorities and the European Charter for Regional or Minority Languages. In addition, it supports member states through co-operation programmes, intercultural inclusion initiatives, Roma and Traveller inclusion, gender equality strategies, and action against hate speech, hate crime and violence against women/domestic violence, as well as exploitation and human trafficking.

This Glossary is therefore far more than a linguistic tool: it is a concrete step towards a Belarus where equality and human dignity will serve as the foundations of a strong and lasting democracy.

**Hallvard Gorseth**
Director of Equal Rights and Dignity
Council of Europe

# Прадмова ад Офісу Святланы Ціханоўскай

Задоўга да 2020 года я выкладаў міжнароднае права ва ўніверсітэце. І ўжо тады зразумеў простую ісціну: дакладнае слова здольнае яднаць людзей. Сёння я адчуваю тую ж адказнасць: падабраць такія словы, якія дапамогуць кожнаму беларусу і кожнай беларусцы ўбачыць у сабе і іншых роўных партнёраў і партнёрак, вольных ад ярлыкоў і перадузятасцяў. Я ўпэўнены, што праца экспертнай групы ў межах Кантактнай групы Рады Еўропы па Беларусі над падрыхтоўкай Кароткага слоўнікаў у сферы роўнасці і недыскрымінацыі – гэта істотны ўнёсак у пабудову будучыні для ўсіх, незалежна ад полу, расы, нацыянальнасці, мовы зносінаў, сэксуальнай арыентацыі, гендарнай ідэнтычнасці ці іншых прыкмет.

Аўтарытарныя рэжымы імкнуцца пасеяць страх і разлад. Яны падмяняюць сэнсы, каб мы засумняваліся ў самім праве быць самімі сабой. Рэжым, пабудаваны за дзесяцігоддзі ў Беларусі, на жаль, не выключэнне. Процідзддзе гэтай палітыцы – веды. Яны ўмацоўваюць чалавечую годнасць і ствараюць прастору для салідарнасці. Няхай кожнае вызначэнне, сабранае на старонках гэтага гласарыя, стане маленькім крокам да пабудовы краіны, дзе ніякая «інакшасць» не будзе падставай для гвалту або выключэння з грамадства.

Эксперты і эксперткі абапіраліся на досвед Рады Еўропы і працу беларускіх праваабаронцаў, якія, нягледзячы на рызыкі, працягваюць абараняць тых, каго хочуць прымусіць замаўчаць або зламаць. Але галоўныя суаўтары і суаўтаркі гэтага Кароткага слоўніка – вы, чытачы і чытачкі: лекары і юрысты, настаўнікі і студэнты, журналісты і валанцёры. Ужываючы гэтыя тэрміны ў сваёй паўсядзённай гаворцы і працы, вы ператвараеце абстрактныя нормы ў жывую практыку павагі.

Офіс Святланы Ціханоўскай і Аб'яднаны пераходны кабінет будуць імкнуцца інтэграваць тэрміналогію і прынцыпы, выкладзеныя ў гэтым Кароткім слоўніку, у сваю палітыку і дзейнасць па абароне правоў беларусаў і беларусак. Мы зробім усё магчымае, каб гэтыя прынцыпы вызначалі нашы заканадаўчыя ініцыятывы, публічныя заявы і працэдуры – каб роўнасць была не лозунгам, а асновай канкрэтных дзеянняў і рашэнняў. Мы таксама будзем заклікаць да гэтага нашых партнёраў і партнёрак у беларускай грамадзянскай супольнасці.

Веру, што ў будучай вольнай Беларусі роўнасць будзе не лозунгам, а звычайнай справай. І калі гэты Кароткі слоўнік дапаможа камусьці разабрацца, як абараніць свае правы ці падтрымаць суседку, якую спрабуюць іх пазбавіць, значыць, мы зрабілі важную справу. Давайце гаварыць дакладней, каб жыць у больш справядлівым грамадстве. І тады свабода абавязкова падтрымае нашу смеласць.

**Дарадца па прававых пытаннях**
Святланы Ціханоўскай,
Леанід Марозаў

# Foreword from the Sviatlana Tsikhanouskaya's Office

Long before 2020, I used to work as a lecturer in international law at a university. And even then, I learned a simple truth: the right words can bring people together. Today, I feel the same responsibility – to choose words that help every Belarusian see themselves and others as equal partners, free from labels and prejudice. I am convinced that the work of the expert group within the Council of Europe's Contact Group on Belarus to develop a glossary on equality and non-discrimination is a meaningful contribution to building a future for all – regardless of gender, race, nationality, language, sexual orientation, gender identity, or any other characteristic.

Authoritarian regimes seek to sow fear and division by distorting meanings and making us doubt our very right to be ourselves. Sadly, the regime that has taken root in Belarus over the decades is no exception. The antidote to this policy is knowledge. It reinforces individual dignity and opens space for solidarity. May every definition in this glossary be a small step toward a country where no form of "otherness" becomes grounds for violence or exclusion.

The experts have drawn on the experience of the Council of Europe and the work of Belarusian human rights defenders who, despite the risks, continue to protect those the regime tries to silence or break. But the most important co-author of this glossary is you – the readers: doctors and lawyers, teachers and students, journalists and volunteers. By using these terms in your daily language and work, you turn abstract principles into a living practice of respect.

The Office of Sviatlana Tsikhanouskaya and the United Transitional Cabinet will strive to integrate the terminology and principles set out in this glossary into their policies and advocacy efforts. We will make every effort to ensure that they guide our legislative proposals, public statements, and institutional practices, so that equality is not only proclaimed but actively implemented. We will also encourage and recommend our partners in Belarusian civil society to do the same.

I believe that in a future free Belarus, equality will no longer be a slogan – it will be a daily norm. And if this glossary helps someone understand how to defend their rights or support a neighbor whose rights are under threat, then we've done something important. Let's speak more precisely, so we can live more justly. And then, freedom will surely reward our courage.

**Leanid Marozau**
Advisor on Legal Affairs to
Sviatlana Tsikhanouskaya

# Прадмова ад Беларускага Хельсінкскага Камітэта

Беларускі Хельсінкскі Камітэт рады зрабіць унёсак у працэс, які прывёў да стварэння гэтага англійска-беларускага Кароткага слоўніка тэрмінаў ў сферы роўнасці і недыскрымінацыі на беларускай мове. Нашыя эксперткі ўдзельнічалі ў мерапрыемствах, дзе фармавалася ідэя такога слоўніка, і падрыхтавалі яго, таму мы рады бачыць, што яна ўвасобілася ў жыццё.

Для грамадзянскай супольнасці Беларусі агульная і дакладная мова ў галіне роўнасці і недыскрымінацыі – гэта больш, чым тэхнічнае пытанне. Гэта аснова эфектыўнага адвакатавання, прававой абароны і канструктыўнага грамадскага дыялогу. Гэты слоўнік распрацаваны як практычны інструмент для тых, хто працуе з правамі чалавека ў Беларусі. Ён прызначаны не толькі для развіцця дыскурсу пра роўнасць і недыскрымінацыю, але і для ўмацавання выкарыстання беларускай юрыдычнай тэрміналогіі пры забеспячэнні яе адпаведнасці міжнародным стандартам у галіне правоў чалавека.

Мы разглядаем прасоўванне і распаўсюджванне беларускай юрыдычнай тэрміналогіі як неад'емную частку больш шырокага працэсу фарміравання нацыянальнай прававой культуры і юрыспрудэнцыі і ўпэўненыя, што гэты працэс будзе развівацца далей пасля таго, як дэмакратычная Беларусь стане чальцом Рады Еўропы. Мы таксама спадзяёмся, што гэты слоўнік будзе садзейнічаць распрацоўцы будучага антыдыскрымінацыйнага заканадаўства дэмакратычнай Беларусі. Мы ўдзячныя Радзе Еўропы за падтрымку ў падрыхтоўцы гэтага выдання.

Слоўнік аб'ядноўвае тэрміны, неабходныя для працы ў сферы права, адвакатавання і адукацыі ў галіне роўнасці і недыскрымінацыі. Мы спадзяёмся, што ён будзе карысны юрыст:кам, праваабаронцам, іншым прадстаўні:цам грамадзянскай супольнасці, а таксама прадстаўні:цам акадэмічнай супольнасці для забеспячэння дакладнасці, паслядоўнасці і яснасці ў іх штодзённай працы дзеля прасоўвання роўнасці, папярэджання дыскрымінацыі і садзейнічання інклюзіі.

Гэтае выданне прызначанае перадусім для выкарыстання – пры падрыхтоўцы прававых тэкстаў, у адвакатаванні, навучанні і перакладзе – а не для пасіўнага чытання. Мы заклікаем карыстальнікаў прымяняць і распаўсюджваць яго, садзейнічаючы не толькі развіццю і ўдасканаленню мовы роўнасці і недыскрымінацыі ў Беларусі, але і фармаванню прававой і сацыяльнай культуры, у якой гэтыя прынцыпы будуць вызначаць будучыню краіны.

**Кацярына Дзяйкала**
Беларускі Хельсінкскі Камітэт

# Foreword from the Belarusian Helsinki Committee

The Belarusian Helsinki Committee is honoured to have contributed to the process that led to the creation of this Glossary of Key Terms on Equality and Non-discrimination in Belarusian. Our experts took part in activities where the idea of such a glossary was shaped, and developed it, so we are pleased to see it come to life.

For Belarusian civil society, a shared and accurate language in the field of equality and non-discrimination is more than a technical matter – it is a foundation for effective advocacy, legal protection, and constructive public dialogue. This Glossary is designed as a practical tool for those who work with human rights in Belarus. It serves not only as a resource for advancing the discourse on equality and non-discrimination, but also as a means of strengthening the use of Belarusian legal terminology while ensuring its alignment with international human rights standards.

We regard the promotion and dissemination of Belarusian legal terminology as an integral part of the broader process of developing a national legal culture and jurisprudence, and we believe that this process will continue to advance once democratic Belarus becomes a member of the Council of Europe. We hope that this Glossary will also contribute to the development of future anti-discrimination legislation in democratic Belarus, and we are grateful to the Council of Europe for supporting its preparation.

The Glossary brings together terms that are essential for legal, advocacy, and educational work in the field of equality and non-discrimination. We hope it will support lawyers, human rights defenders, other civil society actors, as well as members of the academic community in ensuring clarity, consistency, and precision in their daily work to promote equality, prevent discrimination, and foster inclusion.

This publication is intended primarily for use – in legal drafting, advocacy, training, and translation – rather than for passive reading. We encourage users to apply and share it, contributing not only to the development and refinement of equality and non-discrimination language in Belarus, but also to building a legal and social culture in which these principles help shape the country’s future.

**Ekaterina Deikalo**
Belarusian Helsinki Committee

# Частка 1. Беларуска-англійскі слоўнік з тлумачэннем асноўных тэрмінаў на беларускай мове

# Section 1. Belarusian-English Glossary with Explanations of Key Terms in Belarusian

| | | |
|---|---|---|
| Абароненыя прыкметы (падставы дыскрымінацыі) | Protected grounds / characteristics (grounds for discrimination) | Ідэнтыфікавальныя, аб’ектыўныя або асабістыя характарыстыкі або прыкметы, на падставе якіх асобы або групы асобаў адрозніваюцца адна ад другой і дыскрымінацыя на падставе якіх **забароненая прававымі нормамі**.<br><br>Згодна з міжнародным стандартам, сёння да такіх прыкметаў адносяцца: пол, “раса”, колер скуры, нацыянальнае, этнічнае і сацыяльнае паходжанне, мова, рэлігійныя, палітычныя ці іншыя перакананні, удзел або няўдзел у прафсаюзах або іншых грамадскіх аб’яднаннях, сямейнае, маёмаснае або службовае становішча, узрост, стан здароўя, ВІЧ-статус, месца жыхарства, інваліднасць, сексуальная арыентацыя, гендарная ідэнтычнасць, транс-статус, іншыя абставіны або прыкметы рэальныя або меркаваныя.<br><br>Пералік абароненых прыкметаў **не можа быць закрытым і вычарпальным**. Паняцце “іншыя абставіны або прыкметы” павінна трактавацца шырока і не павінна абмяжоўвацца характарыстыкамі, якія з’яўляюцца прыроджанымі ці неад’емнымі. Аднак пералік абароненых прыкметаў не можа пашырацца адвольна і ўключаць любыя прыкметы.<br><br>Новыя абароненыя прыкметы становяцца такімі, калі яны адлюстроўваюць досвед новых уразлівых і пацярпелых сацыяльных групаў, як і тых, што працягваюць падлягаць маргіналізацыі. |

| | | |
|---|---|---|
| Абвешчаны намер дыскрымінаваць | The announced intention to discriminate | Публічная заява або выказванне, якое сведчыць аб намеры дыскрымінаваць пэўную групу або асобу на падставе абароненых прыкметаў. Такое публічнае дзеянне лічыцца дыскрымінацыяй нават пры адсутнасці канкрэтнай ахвяры.<br><br>*Напрыклад*, абвестка пра вакансію, дзе гаворыцца, што іншаземцы не могуць падаваць свае кандыдатуры, - калі ў такога абмежавання няма разумнага аб'ектыўнага абгрунтавання (напрыклад, іншаземцы не могуць працаваць на некаторых пасадах у дзяржаўных органах) - такая абвестка будзе дыскрымінацыяй, нават калі па факце ніводны іншаземец не паўдзельнічаў у конкурсе. |
| Антыдыскрымінацыйная экспертыза | Equality impact assessment | Аналіз праектаў нарматыўных прававых актаў на адпаведнасць палажэнням Закону "Аб роўнасці і недыскрымінацыі" і іншых законаў аб роўнасці пры іх наяўнасці (напрыклад, закону аб гендарнай роўнасці), а таксама міжнародным забавязанням дзяржавы ў сферы роўнасці і недыскрымінацыі. |
| Віктымізацыя (рэпрэсаліі) | Victimisation (reprisals) | Дзеянні або бяздзеянне, якія суправаджаюцца няроўным абыходжаннем або неспрыяльнымі наступствамі для якой-небудзь асобы ў выніку падачы ёю скаргі або выкарыстання іншых прававых працэдураў у мэтах абароны ад дыскрымінацыі або ў мэтах забеспячэння прымянення заканадаўства аб роўнасці, або ў выніку ўдзелу ў прававых працэдурах, выкарыстаных у гэтых жа мэтах трэцяй асобай. |
| Гендарнае самавыражэнне | Gender expression | Прэзентацыя кожным чалавекам свайго гендару праз знешнасць (уключна з адзеннем, прычоскай, аксесуарамі, касметыкай), манеру маўлення, мадэлі паводзінаў, імёны і асабістыя характарыстыкі. Гэта можа адпавядаць або не адпавядаць сацыяльна чаканым праявам, якія звычайна асацыююцца з гендарнай ідэнтычнасцю чалавека. |
| Гендарная ідэнтычнасць | Gender identity | Глыбокае ўнутранае і індывідуальнае перажыванне гендару кожным чалавекам, якое можа адпавядаць або не адпавядаць прысвоенаму пры нараджэнні полу, у тым ліку асабістае адчуванне цела (якое можа ўключаць, пры свабодным выбары, змены знешняга выгляду або функцыяў цела з дапамогай медыцынскіх, хірургічных або іншых сродкаў) і іншыя праявы гендару, у тым ліку адзенне, гаворку і манеры паводзінаў. Гендарная ідэнтычнасць можа супадаць ці не супадаць з гендарным самавыражэннем чалавека. |
| Дамаганні (харасмент) | Harassment | Непажаданыя для асобы або групы асобаў паводзіны, вербальныя, невербальныя або фізічныя (у тым ліку паводзіны сексуальнага характару, але не абмежаваныя імі), мэтай або вынікам якіх з'яўляецца прыніжэнне годнасці або стварэнне для асобы або групы асобаў запужвальных, варожых, зневажальных, абразлівых або крыўдных абставінаў. |

| | | |
|---|---|---|
| Дыскрымінацыя | Discrimination | Любое дыферэнцыяванае абыходжанне (адрозненне, выключэнне, перавага і абмежаванне) на падставе абароненых прыкметаў, якое **мае на мэце або ёсць наступствам** пазбаўлення, абмежавання, прызнання немагчымасці выкарыстання або ажыццяўлення чалавекам правоў і свабодаў нароўні з іншымі.<br><br>Дыскрымінацыя забароненая ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, **рэгуляваных правам**, у тым ліку ў лічбавым асяроддзі. Гэта значыць, што заканадаўчая забарона не можа тычыцца сфер, якія не рэгулююцца правам (напрыклад, пачуцці). |
| | | **Не з'яўляецца дыскрымінацыяй** дыферэнцыяванае абыходжанне (адрозненні, выключэнні, перавагі і абмежаванні), калі яно:<br><br>**а.** аб'ектыўна апраўданае для дасягнення законнай мэты і<br><br>**б.** сродкі яго дасягнення не перавышаюць неабходныя ў дэмакратычным грамадстве (гэта значыць з'яўляюцца сувымернымі для дасягнення законнай мэты).<br><br>Па сутнасці дыскрымінацыя можа праяўляцца ў прамой і ўскоснай формах. Усё астатнія паняцці абазначаюць розныя праявы гэтых формаў (у большасці прамой дыскрымінацыі). |
| Дыскрымінацыя праз атаясамленне | Discrimination by association | Любы акт дыскрымінацыі, здзейснены ў дачыненні да асобы на падставе таго, што яна ўспрымаецца як звязаная з адной або некалькімі асобамі, якія маюць абароненыя прыкметы.<br><br>*Дыскрымінацыя праз атаясамленне* цесна звязаная з дыскрымінацыяй праз успрыманне, часам пад імі разумеецца адное і тое ж. |
| Дыскрымінацыя праз успрыманне | Discrimination based on perception | Любы акт дыскрымінацыі, здзейснены ў дачыненні да асобы, якая ў незалежнасці ад наяўнасці якойсьці з абароненых прыкметаў, успрымаецца як асоба, якая мае такія прыкметы.<br><br>*Дыскрымінацыя праз успрыманне* цесна звязаная з *дыскрымінацыяй* праз атаясамленне, часам пад імі разумецца адное і тое ж. |

| | | |
|---|---|---|
| Дыскрымінацыя, інтэрсекцыйная | Intersectional discrimination | Сітуацыя, у якой асоба падлягае дыскрымінацыі пры накладанні некалькіх абароненых прыкметаў адначасова, і гэтае ўзаемадзеянне ўзмацняе характар дыскрымінацыі.<br><br>*Напрыклад,* тэлевізійная кампанія можа ўсталяваць правілы, у адпаведнасці з якімі будзе спыняць кантракты з жанчынамі- тэлевядоўцамі, старэйшымі за 45 гадоў. У дадзеным выпадку, дыскрымінацыя ўзнікае толькі праз адначасовае спалучэнне прыкметы полу і ўзросту, бо жанчыны маладзейшыя за 45 гадоў, а таксама мужчыны не будуць абмяжоўвацца ў правах. Такім чынам толькі жанчыны пасля 45 гадоў атрымліваюць дадатковую ўразлівасць у кантэксце працы ў якасці тэлевядоўцы ў гэтай кампаніі.<br><br>То бок пры *інтэрсекцыйнай* дыскрымінацыі накладанне некалькіх абароненых прыкметаў ставіць асобу, якая падпадае пад такое перакрыжаванне ў больш неспрыяльнае становішча, чым тое, у якім знаходзяцца асобы, якія маюць адну з такіх прыкметаў.<br><br>Часам інтэрсекцыйная дыскрымінацыя можа ствараць увогуле новы, асобны механізм уздзеяння і абмежавання ў правах для канкрэтнай групы: *напрыклад*, прымусовыя аборты для жанчын з інваліднасцю. То бок жанчыны без інваліднасці а таксама мужчыны з інваліднасцю не будуць падвяргацца менавіта такому абмежаванню рэпрадуктыўных правоў. Тут сітуацыю пагаршае адначасовае спалучэнне дзвюх прыкметаў - інваліднасць і пол.<br><br>Тэрміны, якія вызначаюць дыскрымінацыю па некалькіх прыкметах могуць тлумачыцца па-рознаму. У некаторых выпадках розніца паміж *інтэрсекцыйнай* і *множнай* дыскрымінацыяй можа здавацца размытай. У некаторых крыніцах *множная* дыскрымінацыя выкарыстоўваецца як агульны тэрмін для абазначэння *інтэрсекцыйнай* і *кумулятыўнай* дыскрымінацыі. |
| Дыскрымінацыя, кумулятыўная (накапляльная) | Cumulative discrimination | Сітуацыя, калі асоба падлягае дыскрымінацыі, якая здараецца больш за адзін раз цягам пэўнага часу на падставе адной прыкметы, ці ў асобных выпадках, але на падставе розных абароненых прыкметаў.<br><br>Часам гэты тэрмін выкарыстоўваецца ў значэнні *множнай* дыскрымінацыі, але агулам можа быць сітуацыя "накапляльнага эфекту" і ў выпадку дыскрымінацыі на падставе адной прыкметы. Такая дыскрымінацыя не будзе з'яўляцца множнай: *напрыклад*, калі асобу цягам года не бяруць на працу ў розных месцах на падставе адной і той жа абароненай прыкметы (напрыклад, прыналежнасці да ромскай меншасці). |

| | | |
|---|---|---|
| Дыскрымінацыя, множная | Multiple discrimination | Сітуацыя, у якой асоба падлягае дыскрымінацыі паводле дзвюх ці больш прыкметаў, але пры розных абставінах.<br><br>*Напрыклад*, прадстаўні:цы ЛГБТК+ адмаўляюць у якіх-небудзь паслугах у сувязі з тым, што ён/яна належыць да ЛГБТК+, і не бяруць на працу ў сувязі з узростам.<br><br>Тэрміны, якія вызначаюць дыскрымінацыю па некалькіх прыкметах могуць тлумачыцца па-рознаму. У некаторых выпадках розніца паміж інтэрсекцыйнай і *множнай* дыскрымінацыяй можа здавацца размытай. У некаторых крыніцах *множная* дыскрымінацыя выкарыстоўваецца як агульны тэрмін для абазначэння *інтэрсекцыйнай* і *кумулятыўнай* дыскрымінацыі. |
| Дыскрымінацыя, прамая | Direct discrimination | Любое неабгрунтаванае дыферэнцыяванае *абыходжанне** (у форме дзеяння або бяздзеяння, у тым ліку заканадаўчыя захады) у дачыненні да асобы або групы асобаў у сувязі з меркаванай або рэальнай наяўнасцю ў іх адной або больш абароненых прыкметаў, з прычыны якога асоба або група асобаў не могуць карыстацца сваімі правамі і свабодамі нароўні з іншымі**.<br><br>* Гл. *Дыскрымінацыя*<br><br>**Гл. *Параўнальнік* |
| Дыскрымінацыя, сістэмная | Systemic discrimination | Мадэлі паводзінаў, палітыка ці практыкі, якія з’яўляюцца часткай рэалізаванай дзяржавай (або арганізацыяй) палітыкі і якія **замацоўваюць неспрыяльнае становішча асобаў, аб’яднаных якой-небудзь абароненай прыкметай**. Яна можа праяўляцца праз механізмы, якія паслядоўна дзейнічаюць на карысць адной групы і дыскрымінацыі ў дачыненні да іншых.<br><br>Адной з праяваў сістэмнай дыскрымінацыі з’яўляецца *сегрэгацыя**.<br><br>Для абазначэння дыскрымінацыі, замацаванай на ўзроўні палітыкі, таксама выкарыстоўваюць тэрміны структурная дыскрымінацыя і інстытуцыйная дыскрымінацыя. У некаторых крыніцах паміж імі праводзіцца розніца. Але ж у цэлым мяжа між імі даволі размытая і часам яны выкарыстоўваюцца як сінонімы.<br><br>*Гл. *Сегрэгацыя* |
| Дыскрымінацыя, ускосная | Indirect discrimination | Форма дыскрымінацыі, пры якой у выніку прыняцця або прымянення **фармальна нейтральных** прававых нормаў, крытэрыяў ацэнкі, правілаў, патрабаванняў або практыкі асоба або група асобаў, якія маюць адну або больш абароненых прыкметаў або ўспрымаюцца такімі, не могуць карыстацца сваімі правамі і свабодамі нароўні з іншымі. |

| | | |
|---|---|---|
| Злачынства на глебе нянавісці | Hate crime | Крымінальнае правапарушэнне, здзейсненае з элементам нянавісці на аснове адной або некалькіх фактычных або ўспрыманых асабістых характарыстык або прыкметаў, дзе:<br><br>- "нянавісць" азначае неаб'ектыўнасць, перадузятасць або пагарду;<br><br>- "асабістыя характарыстыкі або прыкметы" тычацца, але не абмяжоўваюцца: "расы", колеру скуры, мовы, рэлігіі, грамадзянства, нацыянальнага або этнічнага паходжання, узросту, інваліднасці, гендару, полу, сексуальнай арыентацыі, гендарнай ідэнтычнасці і самавыказвання, а таксама палавых прыкметаў.<br><br>Гэта азначае, што любое злачынства, акрэсленае як такое нацыянальным заканадаўствам, можа быць злачынствам на глебе нянавісці, калі прысутнічае элемент нянавісці. |
| Інтэрсекс-асобы | Intersex people | Асобы, якія нараджаюцца з біялагічнымі палавымі прыкметамі, якія не адпавядаюць грамадскім нормам або медыцынскім вызначэнням таго, што робіць чалавека мужчынам ці жанчынай. Часам статус інтэрсекс-асобы выяўляецца пры нараджэнні; часам гэта становіцца відавочным толькі пазней, асабліва падчас палавога выспявання.<br><br>Нягледзячы на шырокую разнастайнасць сітуацыяў, большасць інтэрсекс-асобаў фізічна здаровыя. Толькі нямногія з іх пакутуюць ад медыцынскіх станаў / захворванняў, якія ставяць пад пагрозу здароўе.<br><br>*Заўвага:* слова "транссексуал" раней было агульнаўжывальным і яго можна знайсці ў розных дакументах і судовай практыцы (разам з адрозненнем паміж "да аперацыі" і "пасля аперацыі"). Сёння гэты тэрмін састарэў і часта разглядаецца як прыніжальны, паколькі ён вельмі моцна засяроджваецца на атрыманні транс-спецыфічнай медыцынскай дапамогі (то бок, "змене полу", тэрмін, які ўсё яшчэ выкарыстоўваецца ў некаторых судовых рашэннях, але паступова знікае з ужытку) |
| Ксенафобія | Xenophobia | Перадузятасць у дачыненні да, нянавісць да, або страх перад людзьмі з іншых краінаў або культураў. Гэта пачуццё, або ўспрыманне, заснаванае **на сацыяльна сканструяваных вобразах і ідэях, а не на рацыянальных або аб'ектыўных фактах**.<br><br>*Ксенафобія* і *расізм*, якія з'яўляюцца асобнымі з'явамі, на практыцы часта перакрыжоўваюцца, бо розніца ў фізічных характарыстыках часта выкарыстоўваецца для вылучэння "іншага" з супольнасці. |
| ЛГБТ-людзі або ЛГБТ-асобы | LGBT people or LGBT persons | Агульны тэрмін, які выкарыстоўваецца для абазначэння лесбіянак, геяў, бісексуалаў і трансгендарных асобаў. Гэта неаднародная група, якую ў сацыяльнай і палітычнай сферах часта аб'ядноўваюць пад фармулёўкай ЛГБТ. Часам у ЛГБТ уключаюць інтэрсекс-асобаў (ЛГБТІ) і квір-асобаў (ЛГБТІК). |

| | | |
|---|---|---|
| Мова нянавісці / мова варожасці | Hate speech | Паняцце “мова нянавісці” з’яўляецца эмацыйна насычаным, і ў міжнародным праве ў галіне правоў чалавека **не існуе яго агульнапрынятага вызначэння.**<br><br>Спробы вызначыць паняцце “мова нянавісці” звычайна ахопліваюць вельмі шырокі спектр выказванняў, у тым ліку і законных: усе віды выказванняў, якія з’яўляюцца праявамі нецярпімасці, або распальваюць, прапагандуюць, распаўсюджваюць або апраўдваюць гвалт, нянавісць або дыскрымінацыю ў дачыненні да асобы ці групы асобаў, або якія ганяць іх на падставе рэальных або прыпісаных асабістых характарыстык або прыкметаў. Заканадаўчая забарона “мовы нянавісці” залежыць ад цяжкасці наступстваў і шкоды. **Некаторыя формы “мовы нянавісці” абараняюцца стандартам свабоды выказванняў.** |
| Небінарныя або гендарна разнастайныя асобы | Non-binary or gender-diverse persons | Асобы, чый гендарны досвед (гендарная ідэнтычнасць) не ўпісваецца ў традыцыйную дыхатамію “мужчына/жанчына” (г.зн., “гендарную бінарнасць”). Гэта агульны тэрмін, які ахоплівае мноства розных ідэнтычнасцяў.<br><br>Тэрмін “небінарны” не варта блытаць з інтэрсекс-варыяцыямі палавых прыкметаў.<br><br>Тым не менш, сітуацыя з інтэрсекс-асобамі доўгі час разглядалася як па сутнасці медыцынская праблема. Пераважны медыцынскі пункт гледжання заключаўся ў тым, што целы інтэрсекс-дзяцей можна і трэба прывесці ў адпаведнасць або з мужчынскай або з жаночай парадыгмай, часта з дапамогай хірургічнага і/або гарманальнага ўмяшання; што гэта трэба зрабіць як мага раней; і што потым дзеці павінны выхоўвацца ў адпаведнасці з тым гендарам, які адпавядае полу, прысвоенаму іх целам. |
| Падбухторванне да дыскрымінацыі | Incitement to discrimination | Любыя дзеянні і бяздзеянні, з дапамогай якіх асоба аказвае ціск або праяўляе пэўныя паводзіны з мэтай дыскрымінацыі трэцяй асобы, на падставе рэальных або меркаваных абароненых прыкметаў.<br><br>Падбухторванне да дыскрымінацыі часта згадваецца ў кантэксце *мовы нянавісці*, калі трэба шукаць баланс паміж свабодай выказвання і межамі мовы нянавісці.<br><br>У трактоўцы ЕСПЧ **падбухторванне да дыскрымінацыі з’яўляецца формай распальвання нецярпімасці**, якая, разам з падбухторваннем да гвалту і варожасці, з’яўляецца адной з межаў, пераход якіх не можа быць апраўданы свабодай выказвання меркаванняў (*Zemmour v. France, 2022, n. 50*).<br><br>Пры гэтым, ЕСПЧ адзначае, што **падбухторванне да рознага стаўлення не абавязкова з’яўляецца тым жа, што і падбухторванне да дыскрымінацыі** *(Baldassi and Others v. France, 2020, n. 64)* |

| | | |
|---|---|---|
| Пазітыўныя дзеянні (пазітыўныя захады) | Affirmative action (Positive action) | Спецыяльныя часовыя захады (у тым ліку заканадаўчыя, адміністрацыйныя), якія прымаюцца на карысць якой-небудзь групы асобаў **для выпраўлення сістэмных**, гістарычна ўкаранёных праблем у адносінах да гэтай групы і накіраваныя на паскарэнне ўстанаўлення фактычнай роўнасці і эфектыўнай рэалізацыі нароўні з іншымі ўсіх правоў і свабодаў.<br><br>Гэта шырокі тэрмін, які можа ўключаць у сябе розныя віды адмысловых захадаў, скіраваных на заахвочванне або забеспячэнне роўнага абыходжання на практыцы (то бок, роўнасці па сутнасці або роўнасці дэ-факта)*.<br><br>*Гл. *Роўнасць вынікаў* *(фактычная роўнасць)* |
| Палавыя прыкметы | Sex characteristics | Палавыя прыкметы адносяцца да храмасомных, ганадных і анатамічных асаблівасцяў чалавека, якія ўключаюць у сябе асноўныя характарыстыкі, такія як рэпрадуктыўныя органы і геніталіі і/або храмасомныя структуры і гармоны; і другасныя характарыстыкі, такія як цяглічная маса, размеркаванне валасоў, грудзі і/ці целасклад. |
| Параўнальнік (Кампаратар) | Comparator | Асоба (акрамя ахвяры) у сутнасна падобных абставінах, адносна якой можна параўнаць, ці з'яўляюцца наступствы тых ці іншых дзеянняў, іншай нормы або захаду **істотна менш негатыўнымі** за наступствы, з якімі сутыкнулася ахвяра дыскрымінацыі ў падобнай сітуацыі.<br><br>Адносна некаторых праяваў дыскрымінацыі, параўнанне не з'яўляецца часткай юрыдычнага вызначэння. Параўнанне можа быць карысным для разумення таго, як адбываецца дыскрымінацыя, яе канкрэтных праяваў, а таксама наступстваў, але згодна з сучаснымі стандартамі **немагчымасць выявіць параўнальнік не можа быць вырашальным фактарам пры разглядзе справаў аб дыскрымінацыі.** |
| Паталагізацыя меншасцяў SOGIESC | Pathologisation of SOGIESC minorities | Стаўленне да ідэнтычнасці лесбіянак, геяў, бі- і трансгендараў як да хваробаў, распаўсюджвання якіх неабходна пазбягаць праз абмежаванне правоў ЛГБТІ-людзей ці нават праз іх інстытуцыяналізацыю супраць уласнай волі (утрыманне ў турмах ці псіхіятрычных лякарнях і іншых падобных установах, часта пад выглядам "лячэння").<br><br>Законы, прынятыя ў 20 стагоддзі для "абароны моладзі ад гомасексуальнасці", усталяваўшы больш высокі ўзрост згоды на сексуальныя акты паміж асобамі аднаго гендару, чым паміж асобамі рознага гендару, або забараніўшы "публічныя праявы гомасексуальнасці", звычайна прытрымліваюцца гэтага абгрунтавання. Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) **выключыла** "гомасексуальнасць" **са спісу псіхічных захворванняў** у 1990 г., а "гендарную неадпаведнасць" (г.зн., трансгендарнасць) у 2019 г.<br><br>ЕСПЧ адназначна адхіліў аргумент "абароны моладзі" для законаў супраць ЛГБТІ (гл. "*L. and V. against Austria*, 2003, п. 51). |

| | | |
|---|---|---|
| Піраміда нянавісці | The pyramid of hate | Візуальны вобраз, які дэманструе, як укінутае ў глебу насенне нянавісці можа хутка вырасці ад передузятых ідэяў да гвалту на глебе нянавісці. Піраміда паказвае перадузятыя паводзіны, складанасць якіх узрастае знізу ўверх. Хоць такія паводзіны на кожным узроўні негатыўна ўплываюць на асобных людзей і групы, па меры прасоўвання ўверх па пірамідзе, паводзіны маюць больш небяспечныя для жыцця наступствы.<br><br>Калі людзі або ўстановы ставяцца да такіх паводзінаў на больш нізкіх узроўнях як дапушчальных або “нармальных”, гэта спрычыняецца да таго, што паводзіны на наступным узроўні становяцца больш прымальнымі. Піраміда нянавісці дэманструе, што нянавісць, якая сілкуе генацыд, базуецца на прыняцці паводзінаў, апісаных на ніжніх узроўнях піраміды. |
| Разумнае дастасаванне / разумная адаптацыя | Reasonable accommodation / Reasonable adjustments | Унясенне неабходных і дастатковых зменаў, якія не становяцца неадпаведным або неапраўданым цяжарам, калі гэта неабходна ў канкрэтным выпадку для забеспячэння якой-небудзь* асобе або групе асобаў ажыццяўлення ўсіх правоў і свабодаў нароўні з іншымі асобамі. Разумнае дастасаванне (разумная адаптацыя) **не азначае выключна фізічныя прыстасаванні** (пандусы і г.д.), яно ахоплівае любыя неабходныя захады.<br><br>Адмова ў разумным дастасаванні - асобная праява дыскрымінацыі.<br><br>** На сённяшні дзень на ўзроўні стандарту гэта тычыцца людзей з інваліднасцю.* |
| Раса | Race | Слова “раса” ў антыдыскрымінацыйным заканадаўстве тычыцца групаў людзей, якія лічацца адрознымі праз свае фізічныя характарыстыкі, такія як колер скуры. Гэта **парасонавы тэрмін**, які ахоплівае такія паняцці, як этнічная прыналежнасць, колер скуры і/або нацыянальнае паходжанне. Для вызначэння сітуацыі, калі дыскрымінацыя грунтуецца на гэтых падставах, мы гаворым пра **расавую дыскрымінацыю. Расізм і расавая дыскрымінацыя - не адное і тое ж**. Расізм тычыцца пэўных перакананняў*, а расавая дыскрымінацыя - канкрэтнага абыходжання, заснаванага на гэтых перакананнях.<br><br>Увогуле “раса” гэта сацыяльны канструкт.<br><br>Падзел чалавецтва на асобныя біялагічныя тыпы з прыроджанымі псіхічнымі і культурнымі характарыстыкамі з’яўляецца навукова няслушнай і супярэчыць правам чалавека.<br><br>Міжнародная супольнасць адкінула ўсе дактрыны расавай перавагі або тэорыі, якія спрабуюць вызначыць існаванне розных чалавечых расаў, але выкарыстоўвае тэрмін “раса” як парасонавы ў юрыдычных мэтах, як правіла, беручы яго ў двукоссе.<br><br>*Гл. Расізм |

| | | |
|---|---|---|
| Расавы прафайлінг (этнічнае прафіляванне) | Racial profiling (ethnic profiling) | Любое дзеянне, якое прадпрымаецца для забеспячэння бяспекі або абароны грамадскага парадку, **заснаванае на стэрэатыпах** адносна расы, колеру скуры, этнічнага паходжання, рэлігіі, месца паходжання або спалучэння гэтых падставаў з іншымі, **а не на абгрунтаваным падазрэнні**.<br><br>Не існуе адзінага юрыдычнага вызначэння расавага прафайлінгу (этнічнага прафілявання), таму ў розных крыніцах вызначэнні могуць адрозніваца. Але трактоўка міжнародных органаў і судовая практыка дазваляе выдзеліць чатыры галоўных крытэры:<br><br>**а.** гэта дзеянні, якія здзяйсняюцца органамі забеспячэння правапарадку (паліцыя, памежныя, міграцыйныя службы і інш.),<br><br>**б.** гэтыя дзеянні не маюць разумнага абгрунтавання і не абгрунтаваныя аб'ектыўнымі крытэрыямі,<br><br>**в.** гэтыя дзеянні заснаваныя на прыкметах расы, колеру скуры, нацыянальнага або этнічнага паходжання або іх перасячэння з іншымі прыкметамі, такімі як рэлігія, пол або гендар, сексуальная арыентацыя і гендарная ідэнтычнасць, інваліднасць і ўзрост, міграцыйны статус, працоўны ці іншы статус,<br><br>**г.** гэтыя дзеянні здзяйсняюцца ў канкрэтных кантэкстах, такіх як кантроль іміграцыі і барацьба са злачыннай дзейнасцю, тэрарызмам ці іншай дзейнасцю, якая меркавана парушае ці можа прывесці да парушэння закона. |
| Расізм | Racism | Перакананасць, што такая прыкмета, як "раса", колер скуры, мова, рэлігія, нацыянальнасць або нацыянальнае ці этнічнае паходжанне, апраўдвае пагардлівае стаўленне да асобы ці групы асобаў або пачуццё перавагі над асобай або групай асобаў. |
| Ромы | Roma | Назва, абраная на 1-м кангрэсе ромаў у 1971 г. у якасці пераважнага аўтоніму (саманазвы) для ромскага народу, замяніўшы тэрмін "цыган". Але тэрмін выкарыстоўваецца і як парасонавы, які азначае не толькі ромаў, але і сінці, калі, ашкалі,"егіпцян", манушаў і роднасных ім груп насельніцтва ў Еўропе, а таксама вандроўных*.<br><br>Хоць "цыганы" - дагэтуль распаўсюджаны тэрмін, які ўжываецца ва ўсёй Еўропе, і некаторыя ромы ідэнтыфікуюць сябе як цыганы, гэты тэрмін, як правіла, лічыцца прыніжальным і, для некаторых, відавочна расісцкім.<br><br>Ромы - **самая вялікая этнічная меншасць у Еўропе**: іх сукупная колькасць складае каля 12 мільёнаў.<br><br>* *Вандроўныя (travallers)* - традыцыйная вандроўная карэнная этнакультурная група, якая паходзіць з Ірландыі, але тэрмін выкарыстоўваецца і для вызначэння, расцярушаных па Англіі і іншых частках Брытанскіх астравоў. |

| | | |
|---|---|---|
| Роўнасць | Equality | Гэта адна з базавых каштоўнасцяў, якая належыць чалавеку ад нараджэння проста таму, што ён/яна чалавек. Роўнасць - частка прынцыпаў натуральна-прававой тэорыі, якая ў тым ліку кажа пра тое, што ўсе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі, і, такім чынам, карыстаюцца аднолькавымі правамі і заслугоўваюць аднолькавага ўзроўню павагі.<br><br>Прававое развіццё канцэпцыі роўнасці пачалося з замацавання роўных правоў, як асновы роўнасці магчымасцяў*, а пазней - фармаванні інструментаў уліку асаблівасцяў асобных групаў, каб забяспечыць роўнасць вынікаў**.<br><br>*Гл. *Роўнасць магчымасцяў*<br><br>**Гл. *Роўнасць вынікаў* |
| Роўнасць вынікаў (фактычная роўнасць) | Equality of results (de facto (substantive) equality) | Часам можа спатрэбіцца па-рознаму ставіцца да людзей, каб дасягнуць роўнасці, паколькі адрозненні паміж людзьмі могуць ускладніць ім карыстанне сваімі правамі без належнай падтрымкі.<br><br>Іншымі словамі, улады могуць выпрацаваць “пазітыўныя захады”, “часовыя спецыяльныя захады” або “пазітыўныя (кампенсацыйныя) дзеянні” (у тым ліку праз заканадаўчыя, адміністрацыйныя і арганізацыйныя меры) для дасягнення фактычнай роўнасці. Частка такіх захадаў можа быць накіраваная на ўвядзенне абавязку забяспечыць “разумнае дастасаванне”, ці “разумную адаптацыю”.*<br><br>Такое дыферэнцыяванае абыходжанне не будзе разглядацца як дыскрымінацыя, калі крытэры дыферэнцыяцыі з’яўляюцца разумнымі і аб’ектыўнымі, і калі мэта - дасягненне выніку, які з’яўляецца легітымным у адпаведнасці з міжнародным правам у галіне правоў чалавека.<br><br>*Заўвага:* У сувязі з увядзеннем захадаў для дасягнення фактычнай роўнасці можна пачуць тэрмін “пазітыўная дыскрымінацыя”. Але згодна з сучаснымі тэорыяй і практыкай гэты тэрмін лічыцца састарэлым і не ўжываецца. Бо супярэчыць сутнасці дыскрымінацыі - яна па вызначэнні не можа быць пазітыўнай з’явай. Замест яго ўжываецца тэрмін “абгрунтаваная дыферэнцыяцыя” ці “абгрунтаванае няроўнае абыходжанне”.<br><br>*Гл. *Разумнае дастасаванне* |
| Роўнасць магчымасцяў (фармальная роўнасць) | Equal opportunity (de jure (formal) equality) | Прадугледжвае роўнае абыходжанне да ўсіх асобаў як пазіцыю па змаўчанні; роўнасць дасягаецца, калі закон або палітыка ставяцца да ўсіх асобаў нейтральна, гарантуючы роўныя правы, абавязкі і адказнасць. Часам гэтую мадэль называюць *раўнапраўем*. |

| | | |
|---|---|---|
| Сегрэгацыя | Segregation | Палітыка на ўзроўні канкрэтных захадаў праз якія дзяржава (радзей арганізацыя як юрыдычная асоба) **аддзяляе групу асобаў** на падставе адной з абароненых прыкметаў без аб'ектыўнага і разумнага абгрунтавання ў адпаведнасці з прапанаваным вызначэннем дыскрымінацыі.*<br><br>Гл. *Дыскрымінацыя* |
| Сексуальная арыентацыя | Sexual orientation | Здольнасць кожнага чалавека адчуваць глыбокае эмацыйнае, афектыўнае і сексуальнае прыцягненне да асобаў іншага гендару ці таго ж гендару, або больш чым аднаго гендару, а таксама ўступаць з імі ў інтымныя і сексуальныя стасункі.<br><br>Словы "гомасексуаліст" і "бісексуаліст" першапачаткова з'явіліся ў медыцынскай літаратуры; хоць яны і дапамаглі зрушыць акцэнт з крымiналізацыі, на сённяшні дзень іх імкнуцца не выкарыстоўваць, паколькі мяркуецца, што яны паталагізуюць і празмерна падкрэсліваюць сексуальнае вымярэнне. Пераважнымі тэрмінамі з'яўляюцца "лесбіянкі, геі або бі" (ЛГБ). |
| Трансгендарная жанчына | Transgender woman | Трансгендарная жанчына – гэта чалавек, якому пры нараджэнні быў прыпісаны "мужчынскі" пол, але гендарная ідэнтычнасць якога з'яўляецца "жаночай" або знаходзіцца ў спектры жаночай гендарнай ідэнтычнасці.<br><br>Аналагічныя паняцці для абазначэння сексуальнай арыентацыі трансгендараў выкарыстоўваюцца ў залежнасці ад іх гендарнай ідэнтычнасці, а не полу, прысвоенага ім пры нараджэнні. Напрыклад, лесбійская трансгендарная жанчына адчувае прыхільнасць да партнёрак жаночага полу. |
| Трансгендарны мужчына | Transgender man | Трансгендарны мужчына – гэта чалавек, якому пры нараджэнні быў прыпісаны "жаночы" пол, але гендарная ідэнтычнасць якога з'яўляецца "мужчынскай" або знаходзіцца ў спектры мужчынскай гендарнай ідэнтычнасці. Аналагічныя паняцці для абазначэння сексуальнай арыентацыі трансгендараў выкарыстоўваюцца ў залежнасці ад іх гендарнай ідэнтычнасці, а не полу, прысвоенага ім пры нараджэнні. Напрыклад, гетэрасексуальны трансгендарны мужчына – гэта трансгендарны мужчына, якога прыцягваюць партнёркі жаночага полу. |
| Трансгендарныя асобы | Transgender people or transgender persons | Асобы, што маюць гендарную ідэнтычнасць, якая адрозніваецца ад гендару, прысвоенага ім пры нараджэнні, і тыя, што жадаюць выявіць сваю гендарную ідэнтычнасць іншым спосабам, чым праз гендар, прысвоены ім пры нараджэнні. |

| | | |
|---|---|---|
| | | Сюды ўваходзяць тыя людзі, якія адчуваюць, што аддаюць перавагу або выбіраюць – праз вопратку, аксесуары, манеры паводзінаў, гаворку, касметыку або мадыфікацыю цела – прэзентаваць сябе інакш, чым таго чакаюць ад гендарнай ролі, прыпісанай ім пры нараджэнні. Да іх адносяцца, у прыватнасці, людзі, якія не атаясамліваюць сябе з ярлыкамі “мужчына” або “жанчына”. |
| Цяжар даказвання | Burden of proof | Працэсуальны інструмент, які вызначае, які бок абавязаны падаваць доказы. Звычайна, доказы прадстаўляюцца асобай, якая прад’яўляе прэтэнзіі (звяртаецца ў суд).<br><br>У справах аб дыскрымінацыі размеркаванне цяжару даказвання вызначаецца іншым чынам, чым паводле звычайных правілаў грамадзянскага працэсу, таму што **ахвяра і асоба, якая дыскрымінуе знаходзяцца ў няроўным становішчы.**<br><br>У справах аб дыскрымінацыі цяжар даказвання ўскладаецца на асобу, якая меркавана дыскрымінуе. Гэта значыць, што асоба, якая падае пазоў у судовую (ці іншую) інстанцыю, павінна прадставіць довады, якія дазваляюць меркаваць аб магчымым факце дыскрымінацыі, але даказванне таго, **што акт не з’яўляецца дыскрымінацыяй** (то бок што дыферэнцыяванае абыходжанне апраўданае), ускладаецца на адказчыка (дзяржаўныя органы ці бізнес). Такім чынам, не ахвяра павінна даказваць, што яе дыскрымінавалі, а суб’ект, які дыскрымінуе павінен даказаць, што дыскрымінацыі не было.<br><br>*Выключэнні:* дзеянні, якія цягнуць крымінальную адказнасць (там дзейнічае прэзумпцыя невінаватасці). |
| Этнічная прыналежнасць | Ethnicity | Прыналежнасць да групы, якая адрозніваецца сукупнасцю характарыстыкаў, такіх як асобная рэлігія, культура, геаграфічнае паходжанне, гісторыя і мова. |
| SOGIESC (сексуальная арыентацыя, гендарная ідэнтычнасць, гендарнае самавыражэнне і палавыя прыкметы) | SOGIESC (sexual orientation, gender identity, gender expression and sex characteristics) | Абрэвіятура, якая абазначае сексуальную арыентацыю (SO), гендарную ідэнтычнасць, гендарнае самавыражэнне (GIE) і палавыя прыкметы (SC). Гэта асобныя аспекты ідэнтычнасці і паводзінаў чалавека: напрыклад, прыналежнасць да інтэрсекс-асобаў не цягне за сабой якую-небудзь пэўную сексуальную арыентацыю або гендарную ідэнтычнасць і наадварот.<br><br>Дыскрымінацыя на падставе прыкметаў SOGIESC можа прымаць вельмі розныя праявы і закранаць розныя аспекты ідэнтычнасці асобы.<br><br>Важна разумець розныя канцэпцыі і тэрміналогію. У старых дакументах Рады Еўропы або ў ранейшай судовай практыцы ЕСПЧ могуць выкарыстоўвацца іншыя, састарэлыя фармулёўкі, паколькі лінгвістычная эвалюцыя ў гэтай галіне адбываецца хуткімі тэмпамі. |

| | | |
|---|---|---|
| | | У розных мовах ці нават у розных дзяржавах-чальцах Рады Еўропы некаторыя словы могуць быць больш распаўсюджанымі, чым іншыя, мець (або не мець) негатыўнае адценне і ўключаць (або выключаць) пэўныя тыпы сітуацыяў. У цэлым, рэкамендуецца звярнуць увагу на словы (і займеннікі), якія выкарыстоўваюцца самімі ЛГБТІ асобамі ў вашай практыцы, і паважаць іх выбар у гэтым пытанні. |

# Частка 2.
# Англійска-беларуская табліца адпаведнасці асноўных тэрмінаў

# Section 2.
# English-Belarusian Correspondence Table of Key Terms

| | |
|---|---|
| Affirmative action<br>(Positive action) | Пазітыўныя дзеянні<br>(пазітыўныя захады) |
| Burden of proof | Цяжар доказвання |
| Comparator | Параўнальнік (Кампаратар) |
| Cumulative discrimination | Дыскрымінацыя, кумулятыўная (накапляльная) |
| Direct discrimination | Дыскрымінацыя, прамая |
| Discrimination | Дыскрымінацыя |
| Discrimination by  association | Дыскрымінацыя праз атаясамленне |
| Discrimination based on perception | Дыскрымінацыя праз успрыманне |
| Equal opportunity<br>(de jure (formal) equality) | Роўнасць магчымасцяў<br>(фармальная роўнасць) |
| Equality | Роўнасць |
| Equality impact assessment | Антыдыскрымінацыйная экспертыза |
| Equality of results<br>(de facto (substantive) equality) | Роўнасць вынікаў<br>(фактычная роўнасць) |
| Ethnicity | Этнічная прыналежнасць |
| Gender expression | Гендарнае самавыражэнне |
| Gender identity | Гендарная ідэнтычнасць |
| Harassment | Дамаганні (харасмент) |
| Hate crime | Злачынства на глебе нянавісці |
| Hate speech | Мова нянавісці |
| Incitement to discrimination | Падбухторванне да дыскрымінацыі |
| Indirect discrimination | Дыскрымінацыя, ускосная |
| Intersectional discrimination | Дыскрымінацыя, інтэрсекцыйная |
| Intersex people | Інтэрсекс-асобы |
| LGBT people or LGBT persons | ЛГБТ-людзі або ЛГБТ-асобы |
| Multiple discrimination | Дыскрымінацыя, множная |

| | |
|---|---|
| Non-binary or gender-diverse persons | Небінарныя або гендарна разнастайныя асобы |
| Pathologisation of SOGIESC minorities | Паталагізацыя меншасцяў SOGIESC |
| Protected grounds / characteristics (grounds for discrimination) | Абароненыя прыкметы (падставы дыскрымінацыі) |
| Race | Раса |
| Racial profiling (ethnic profiling) | Расавы прафайлінг (этнічнае прафіляванне) |
| Racism | Расізм |
| Reasonable accommodation / Reasonable adjustments | Разумнае дастасаванне / разумная адаптацыя |
| Roma | Ромы |
| Segregation | Сегрэгацыя |
| Sex characteristics | Палавыя прыкметы |
| Sexual orientation | Сексуальная арыентацыя |
| SOGIESC (sexual orientation, gender identity, gender expression and sex characteristics) | SOGIESC (сексуальная арыентацыя, гендарная ідэнтычнасць, гендарнае самавыражэнне і палавыя прыкметы) |
| Systemic discrimination | Дыскрымінацыя, сістэмная |
| The announced intention to discriminate | Абвешчаны намер дыскрымінаваць |
| The pyramid of hate | Піраміда нянавісці |
| Transgender man | Трансгендарны мужчына |
| Transgender people or transgender persons | Трансгендарныя асобы |
| Transgender woman | Трансгендарная жанчына |
| Victimisation (reprisals) | Віктымізацыя (рэпрэсаліі) |
| Xenophobia | Ксенафобія |

Кароткі слоўнік тэрмінаў ў сферы роўнасці і недыскрымінацыі не з'яўляецца вычарпальным і змяшчае асноўную тэрміналогію ў гэтай сферы. Як тэрміны, так і іх тлумачэнні базуюцца на міжнародных і еўрапейскіх стандартах у гэтай галіне, ахопліваючы ў тым ліку антыдыскрымінацыйныя прававыя нормы Еўрапейскага Саюзу (acquis), Агульныя палітычныя рэкамендацыі Еўрапейскай камісіі супраць расізму і нецярпімасці (ECRI), а таксама практыку Еўрапейскага суда па правах чалавека.

This Glossary of Key Terms on Equality and Non-discrimination in Belarusian contains basic terminology in this field and is not intended to cover all relevant terms. Both the terms and their explanations are based on the international and European standards in this domain, including the European Union anti-discrimination acquis, the General Policy Recommendations of the European Commission against Racism and Intolerance (ECRI), and the case law of the European Court of Human Rights.

PREMS 152425

ENG

www.coe.int

The Council of Europe is the continent's leading human rights organisation. It comprises 46 member states, including all members of the European Union. All Council of Europe member states have signed up to the European Convention on Human Rights, a treaty designed to protect human rights, democracy and the rule of law. The European Court of Human Rights oversees the implementation of the Convention in the member states.

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE